Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 КРАСАВІКА 2017 г. СУБОТА № 67 (28431)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Як уладкавацца на АЭС**

СТАР. 3



**Круглы стол: таямніцы першадрукара**

СТАР. 8



**Рыбалка па законе**

СТАР. 14

# Не рэформы, а ўдасканаленне

## Навука перш за ўсё павінна быць практыка-арыентаванай

**Чаго не хапае ў распрацоўках айчынных навукоўцаў? Як максімальна зблізіць навуку і галіны гаспадаркі дзяржавы? Гэтыя пытанні падняў учора ў Нацыянальнай акадэміі навук Прэзідэнт падчас нарады аб праблемах і перспектывах развіцця беларускай навукі.**

Яна атрымалася даволі працяглай, але назваць яе фармальнай ніяк нельга. Ва ўступным слове кіраўнік краіны папрасіў удзельнікаў нарады гаварыць шчыра і выказваць сваю асабістую пазіцыю. Літаральна з кожным дакладчыкам у кіраўніка дзяржавы атрымаўся змястоўны дыялог пра сучаснасць і будучыню беларускай навукі.

— Мы павінны выкрышталізаваць тыя праблемы, на якія вы павінны звярнуць маю ўвагу для прыняцця рашэння. Мы ўсе ў гэтым зацікаўленыя, і вы перш за ўсё, — заявіў Прэзідэнт. — Я вельмі хачу, каб мы, сустрэўшыся чарговы раз, прынялі тыя рашэнні, якія сёння неабходныя для навукі. Для таго, каб навука рухалася наперад і развівалася.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў, каб праблемы не замоўчваліся, каб абмяркоўваліся адкрыта. Ён звярнуў увагу, што навуковую галіну рэфармаваць не трэба, увогуле, слова «рэформы» тут не вельмі да месца, размова павінна ісці пра ўдасканаленне таго, што маем.

Гаворачы на тэму дзяржаўнага кіравання навуковай сферай, Прэзідэнт агучыў праблемы, якія сёння ў ёй ёсць. Гэта раз'яднанасць органаў дзяржаўнага кіравання, саперніцтва акадэмічнага, галіновага сектараў навукі і сектара ВНУ замест узаемавыгаднага партнёрскага супрацоўніцтва.

СТАР. 2




Фота БЕЛТА.

3D-сканавальны лазерны Раманаўскі спектрометр Confotec MR350, ТАА «Сол інструментс».

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У рэгіёнах вядзецца актыўная тлумачальная работа з грамадзянамі па праблемных пытаннях, і яна дае вынік. Мы стараемся бываць у калектывах, удзельнічаць у дыялогу, чуць людзей на месцах. Колькасць зваротаў знізілася — гэта ўжо пэўны станоўчы вынік. Падчас дыялогу з прадстаўнікамі дзяржорганаў людзі агучваюць свае прапановы, якія датычацца паляпшэння сацыяльнага абслугоўвання, далейшага развіцця эканомікі, і іншыя пытанні. Мы ўсё гэта бяром на карандаш, даём адпаведныя тлумачэнні і вырашаем праблемныя пытанні».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8938 | ▲ |
| Еўра | 2,0131 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0332 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0702 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Ёсць праблема

# ДЗІЦЯ ХОЧА ЕСЦІ КОЖНЫ ДЗЕНЬ

## Чаму расце колькасць бацькоў, якія ўхіляюцца ад аплаты аліментаў?

**Пракуратура Брэсцкай вобласці забіла трывогу. Колькасць неплацельшчыкаў аліментаў апошнім часам расце такімі тэмпамі, што правапарушэнні, звязаныя з ухіленнем ад утрымання дзяцей, занялі другую пазіцыю пасля крадзяжоў. Кожны дзясяты правапарушальнік Брэсцкай вобласці — гэта неплацельшчык грошай на патрэбы ўласных дзяцей. На адной з апошніх каардынацыйных нарад праваахоўных органаў з кіраўніцтвам вобласці абмяркоўвалі гэту праблему. Але знайсці адназначныя адказы на пытанні, якія ўзнікалі ў ходзе нарады, часам было зусім не проста.**

У лічбах сітуацыя выглядае так: летась на Брэстчыне пацярпела 1,3 тысячы дзяцей, якім бацькі не цалкам або з затрымкай плацілі грошы. 500 дзяцей не атрымлівалі дапамогу зусім. Адсюль, як правіла, вынікаюць матэрыяльныя, сацыяльныя, а то і крымінальныя праблемы.

Асаблівая красамоўным сведчаннем таму можа быць гісторыя грамадзяніна В. Яшчэ ў 2002 годзе суд абавязаў яго да выплаты аліментаў на ўтрыманне малалетняга сына. Калі спачатку згаданы бацька сяк-так пералічваў грошы, то ў 2014—2015 гадах праваахоўнымі органамі зафіксаваны факт ухілення ад аплаты аліментаў. Грамадзянін не працаваў і нічым не дапамагаў сям'і. У гэты час яго 14-гадовы сын разам з таварышамі здзейсніў серыю крадзяжоў з аўтамашын. Падлетка паставілі на ўлік у інспекцыі па справах непаўналетніх. Маці хлопчыка прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне бацькоўскіх абавязкаў. Так уся сям'я за кароткі час аказалася крымінальнай. Магчыма, што да крадзяжу гэтага школьніка падштурхнулі менавіта матэрыяльныя праблемы. Ён пастаўлены на ўлік, з ім праводзіцца пэўная прафілактычная работа. Але ці ёсць падставы чакаць, што сённяшні падлетак некалі стане добрым бацькам для ўласнай сям'і і не будзе ўхіляцца ад утрымання сваіх дзяцей? Хацелася б спадзявацца. У гэтай сітуацыі многае залежыць цяпер ад маці. Калі яна здолее ўтрымаць дзіця ад далейшага маральнага падзення, можа, толк і будзе. Бацька для яго дакладна прыкладам ніколі не стане.

СТАР. 4

■ Захапленні

# ПАМІЖ АБЛОКАМІ

**Першая відэакамера ў кіналетапісца Дзмітрыя ІЎЧАНКІ з'явілася ў пачатку 1990-х гадоў. А фатаграфаваць яго навучыў бацька яшчэ ў дзяцінстве. Тады ж, акрамя сваякоў і сяброў, на яго картачках стаў з'яўляцца родны Талачын. Потым Дзмітрый пачаў здымаць дакументальнае кіно.**

### Паспець галоўнае

Ён сам прыдумвае тэмы і сцэнарыі. Пасля асноўнай работы на чыгунцы (на Аршанскай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі) электрамеханік Іўчанка ідзе ў кінастудыю самадзейных аператараў «Летапіс», якую ў 1965 годзе заснаваў пры Талачынскім Доме культуры краязнаўца Анатоль Шнэйдар. Цяпер вядомаму талачынскаму кінааматару 85. Яго пераемнікам на вельмі творчай і адказнай пасадзе стаў Дзмітрый. Апошні паспявае не толькі працаваць на двух работах, апрацоўваць зямельны ўчастак, але і вандраваць...

СТАР. 4



Дзмітрый ІЎЧАНКА.